*Д. У. Філіпчык*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*D. Philipchik*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94**

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МУЗЕЯМІ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1991–2016 ГГ.

# INTERPRETATION OF THE INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE OF BREST REGION MUSEUMS IN 1991–2016

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць музеяў Брэсцкай вобласці па дакументаванні, вывучэнні, выкарыстанні ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Прадстаўлены статыстычныя дадзеныя, абазначаны праблемныя моманты ў дакументаванні НКС, прыведзены прыклады найбольш эфектыўнай інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай спадчыны музеямі Брэсцкай вобласці.*

*Ключавыя словы: нематэрыяльная культурная спадчына; музей; музейная інтэрпрэтацыя; культурна-адукацыйная дзейнасць музея; экспазіцыйна-выставачная дзейнасць музея; Брэсцкая вобласць.*

*The article covers the Brest region museums' efforts in documenting, researching and using non-material cultural heritage in expositional, cultural and educational activity. Statistical data are presented, non-material cultural heritage documentation problems are proponed, the most effective non-material heritage interpretation examples by Brest region museums are given.*

*Key words: intangible heritage; museum; museum interpretation; cultural and educational activities of the museum; exposition and exhibition activities of the museum; Brest region.*

Ва ўмовах вельмі дынамічных мадэрнізацыйных працэсаў у грамадстве (урбанізацыя, стандартызацыя побыту, шырокае тыражыраванне ўзораў масавай культуры) захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС) становіцца надзвычай актуальнай задачай для ўсяго беларускага грамадства. Паводле дакументаў ЮНЭСКА да НКС адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны» [1]. Зразумела, што зберагчы яе цалкам і ў нязменным «законсерваваным» выглядзе немагчыма (і ўвогуле, ці трэба), як немагчыма аднавіць умовы, у якіх гэта спадчына стваралася і развівалася. Тым не менш, рэальна захаваць найбольш жыццяздольныя элементы НКС. На падставе гэтых элементаў магчыма фарміраваць у новых пакаленняў беларусаў культурную ідэнтычнасць, патрыятызм, адметны светапогляд.

Мэта дадзенага даследавання – вызначыць ролю музеяў Брэсцкай вобласці ў справе інтэрпрэтацыі і захавання НКС.

Адпаведна мэце пастаўлены наступныя задачы:

• прааналізаваць экспедыцыйную дзейнасць музеяў, скіраваную на дакументаванне НКС, збор артэфактаў, звязаных з нематэрыяльнай спадчынай;

• выявіць асаблівасці адлюстравання НКС у музейнай экспазіцыі і часовых выставах;

• вызначыць магчымасці выкарыстання НКС у культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў.

Дадзенае даследаванне абапіраецца на архіўныя матэрыялы і статыстычныя дадзеныя, што датычацца 13 музеяў[1]. Брэсцкай вобласці раённага падпарадкавання сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якія актыўна ў перыяд з 1991 г. па 2016 г. займаліся інтэрпрэтацыяй НКС: Баранавіцкі краязнаўчы музей, Бярозаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей, Жабінкаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей, Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава, Лунінецкі раённы краязнаўчы музей, Мотальскі музей народнай творчасці, Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок», Музей Беларускага Палесся, Музей-сядзіба «Пружанскі палацык», Раённы музейны комплекс Н. Орды, Столінскі раённы краязнаўчы музей [2, с. 110]. У даследаванні разглядаюцца раённыя музеі і іх філіялы. Міжнародны досвед сведчыць аб тым, што менавіта дадзеныя музеі валодаюць найбольшым патэнцыялам у захаванні і інтэрпрэтацыі НКС. Гэта, галоўным чынам, абумоўлена іх набліжанасцю да носьбітаў НКС, магчымасцю ўзаемадзейнічаць непасрэдна з носьбітамі спадчыны, спрыяць практыцы непарыўнай трансляцыі НКС [3]. Паколькі ў межах дадзенага даследавання немагчыма падрабязна адлюстраваць дзейнасць ножнага з разглядаемых музеяў, мы прывядзём найбольш удалыя і эфектыўныя прыклады працы з НКС і статыстычныя дадзеныя, атрыманыя ў выніку апрацоўкі матэрыялаў архіва ІМЭФ. У мэтах даследавання пад музейнай інтэрпрэтацыяй НКС будзем разумець дакументаванне, вывучэнне элементаў гэтай спадчыны, іх выкарыстанне ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці музея [4, с. 52].

*Дакументаванне НКС.* Разглядаемымі ў дадзеным даследаванні музеямі ў 1991–2016 гг. сфарміраваны значныя этнаграфічныя калекцыі. У гэтых калекцыях захоўваюцца ў тым ліку і артэфакты, звязаныя з нематэрыяльнай спадчынай. Хаця такія артэфакты самі не з’яўляюцца НКС, але без іх наяўнасці ў музейнай прасторы надзвычай складана гэту спадчыну прадставіць.

Найбольш эфектыўна дакументаваннем НКС музейныя спецыялісты займаюцца падчас музейных экспедыцый. 38 % музейных устаноў (з разглядаемых намі) ажыццяўляла штогадовыя музейныя эспедыцыі з мэтай камплектавання фондаў, этнаграфічнага вывучэння рэгіёну, дакументавання НКС. Астатняя частка музеяў займаецца гэтай працай эпізадычна.

[1] Усяго ў вобласці дзейнічае 21 музей сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

У большасці з музеяў створаны базы дадзеных, якія ўтрымліваюць фота-, аўдыё-, відэафіксацыю абрадаў, традыцыйных святаў, рамёстваў і промыслаў. Так у Ганцавіцкім раённым краязнаўчым музеі сфарміравана база дадзеный (аўдыё- і відэафайлы), якая ўтрымлівае запісы песень і абрадаў у выкананні фальклорна-этнаграфічных гуртоў «Завіца» і «Хатовічы» [5, с. 9]. У Івацэвіцкім гісторыка-краязнаўчым музеі акрамя фотафіксацыі прадметаў з этнаграфічнай калекцыі захоўваецца відэафільм «Намскі вялікдзень», які з'яўляецца фіксацыяй элемента НКС, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [6]. У Мотальскім музеі народнай творчасці захоўваецца фота- і відэафіксацыя абрадаў каляндарнага цыклу і сямейна-радзіннай абраднасці (Каляды, Купалле, Жніво, Вяселле – Каравай, Прыданы, Свахі і інш.) [5, л. 19]. Дзейнасць па дакументаванні НКС Мотальскага музея народнай творчасці асабліва вылучае той факт, што супрацоўнікамі дадзенай установы праведзена работа па падрыхтоўцы і прадстаўленні матэрыялаў на ўнясенне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь элемента НКС «Вясельная каравайная традыцыя вескі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці» [7, л. 3].

*Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць.* Этнаграфічныя раздзелы ў экспазіцыі прысутнічаюць у 77 % музеяў. У экспазіцыях музеяў прасочваецца тэндэнцыя да паслядоўнага і часта тыпавога адлюстравання побыту і рамёстваў рэгіёну пры ігнараванні іншых абласцей НКС. Але прысутнічаюць і цікавыя экспазіцыйныя рашэнні з эфектыўным адлюстраваннем НКС у экспазіцыйнай прасторы.

Пастаянная экспазіцыя Мотальскага музея народнай творчасці размешчана ў 7 залах. Экспазіцыя музея адлюстроўвае матэрыяльную і духоўную культуру заходняга Палесся, мясцовыя яе асаблівасці. Кожная экспазіцыйная зала змяшчае элементы вуснай народнай творчасці: прыказкі, прымаўкі, вытрымкі з песень – адпаведна тэматычнай канцэпцыі. Прычым фальклорныя тэксты змешчаны пераважна на мясцовым дыялекце. Інтэр'ер сялянскай хаты і транспартныя сродкі прадстаўлены ў зале «Гісторыя і сялянскі побыт». У зале рамёстваў экспануюцца вырабы мясцовых майстроў па дрэве, кавалёў, рымараў і інш. Зала земляробства прадстаўляе сельскагаспадарчыя прылады працы, земляробчую абраднасць каляндарнага цыкла. Далей часткі экспазіцыі раскрываюць тэмы апрацоўкі лёну, ткацтва, мясцовага традыцыйнага строю. Важна адзначыць, што цэлая музейная зала прысвечана мясцовай абраднасці. У 2008 г. адкрылася экспазіцыя ў будынку ветранога млына, якая знаёміць з тэхналогіяй і асаблівасцямі памолу зерня.

Экспазіцыя музея народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» размешчана ў 7 залах. У раздзеле «Лён – ткацтва» раскрываюцца падтэмы «Семя і гатункі лёну», «Асноўныя віды ткацтва», «Асноўныя арнаменты ручнікоў». Дэманструюцца прылады апрацоўкі лёну, прасніца з кудзеляй у інтэр'еры сялянскай хаты (дапаўняецца майстар-класам па прадзенні), ручнікі, з прыкладамі найбольш распаўсюджаных арнаментаў. Раздзел «Бездзежскі

фартушок – старонкі стварэння» знаёміць наведвальнікаў з характэрнымі прыкладамі распаўсюджаных у в. Бездзеж і наваколлі фартухоў. Дапаўняе экспазіцыю ткацкі станок, на якім дэманструецца працэс стварэння палатна. У раздзеле «Сучаснае ткацтва і вышыўка» прадстаўлены тканыя і вышытыя вырабы, якія былі зроблены майстрамі ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. Кожны з раздзелаў экспазіцыі дапаўняецца блокамі фотаздымкаў, а таксама прыладамі працы, што выкарыстоўваліся ў адпаведным працэсе. З 2012 г. пры музеі дзейнічае асобная экспазіцыя «Каля Плэса». Яна ўяўляе сабой сялянскі падворак, створаны ў межах абласной праграмы захавання і развіцця культуры Брэсцкай вобласці. Па сутнасці створана рэканструкцыя сялянскага двара пач. XX ст., якая знаёміць з інтэр’ерам хаты, асноўнымі сельскагаспадарчымі заняткамі, мясцовай культурай харчавання і традыцыйнымі стравамі [8].

Асноўная экспазіцыя Столінскага раённага краязнаўчага музея размешчана ў 6 залах. Зала «Этнаграфія Століншчыны» распавядае аб традыцыйных рамёствах: ганчарства, ткацтва, бандарства. Прадстаўлены прылады працы, кросны, ручнікі і традыцыйны строй Століншчыны сяр. XIX – пач. XX ст. [9, с. 517]. У 2008 г. на правах філіяла ў в. Гарадная адчынены музей-сядзіба ганчара. У экспазіцыі адноўлены інтэр’ер майстэрні ганчара, яго жылля. Прадстаўлены ганчарнае кола, месца захоўвання гатовых вырабаў, печ для абпальвання посуду, горн і інш. Музей-сядзіба па сваёй сутнасці з’яўляецца інтэрактыўнай экспазіцыяй, якая дазваляе наведвальнікам паўдзельнічаць ва ўсім тэхналагічным працэсе стварэння посуду з гліны [10].

У выставачнай дзейнасці назіраюцца тэндэнцыі да актыўнай прэзентацыі рамёстваў і промыслаў, побыту. Амаль усе музеі (92 %) арганізоўвалі часовыя выставы, прысвечаныя розным абласцям НКС. Размеркаваўшы выставы па тэматыцы атрымалася, што пераважная большасць з іх прысвечана традыцыйным рамёствам (78 %).

Музеем-сядзібай Пружанскі палацык неаднаразова арганізоўваліся выставы, прысвечаныя НКС і яе носьбітам. У 1999 г. праходзіла выстава работ М. В. Тарасюка і майстра-ганчара А. Р. Такарэўскага. Выставы прац майстра М. В. Тарасюка праходзілі ў 2001, 2005, 2007, 2012, 2016 гг. [5, л. 29].

Тэматычныя выставы («Палескі ручнік», «Вялікдзень»), прысвечаныя НКС палескага рэгіёну, арганізоўваліся Музеем Беларускага Палесся [5, л. 25].

Лунінецкім раённым краязнаўчым музеем ладзіліся выставы, прысвечаныя традыцыйным рамёствам: выстава саламяных вырабаў «Саламяная казка», выстава «Касцюмы Лунінеччыны» і інш. Адкрыццё выстаў часта суправаджалася майстар-класамі і сустрэчамі з народнымі майстрамі [11, с. 691].

Музеем народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» быў арганізаваны цэлы шэраг выстаў, звязаных з НКС. Гэта «Багацце бездзежскага куфра» (ткацтва), «Цудоўныя ўзоры на бездежскіх фартушках» (калекцыя фартухоў), «Матуліны ўзоры» (калекцыя ручнікоў), «Хата бездежскай маладой» (інтер’ер хаты, касцюм маладой, вясельныя традыцыі), выстава глінянага посуду к. XIX – пач. XX ст. [7, л. 23].

Розным бакам традыцыйнай культуры рэгіёна і НКС былі прысвечаны выставы Івацэвіцкага гісторыка-краязнаўчага музея. У 2011 г. прайшла выстава «Рамёствы прадзедаў» з экспанаваннем прадметаў этнаграфіі. Выстава «Лён, нейлон, капрон і зноў лён» з экспанаваннем адзення пінска-івацэвіцкага строю прайшла ў 2015 г. У 2016 г. экспанаваліся прадметы этнаграфічнай калекцыі на выставе «Бабін кут». Адкрыццё выстаў часта суправаджаецца майстар-класамі па традыцыйных рамёствах з удзелам носьбітаў НКС [12].

Культурна-адукацыйная дзейнасць раённых музеяў Брэсцкай вобласці характарызуецца актыўным выкарыстаннем разнастайных формаў узаемадзеяння з музейнай аўдыторыяй. Найчасцей музейныя ўстановы звяртаюцца да музейна-педагагічных заняткаў, якія распрацаваны і праводзяцца у 77% разглядаемых намі музеяў. Музейна-педагагічныя заняткі ахопліваюць усе вобласці НКС, але не ў аднолькавай ступені. Хаця найбольш часта сустракаецца тэматыка рамёстваў і промыслаў (36 %), але ў той жа час амаль столькі ж заняткаў (32 %) прысвечана традыцыйным цырымоніям (абрадам, святам). Падобныя суадносіны назіраюцца і ў тэматыцы музейных лекцый, музейных святаў. Музейныя святы для прэзентацыі і папулярызацыі элементаў НКС выкарыстоўваюць 69 % разглядаемых музеяў. Столькі ж музеяў супрацоўнічаюць з народнымі майстрамі, фальклорнымі калектывамі, цэнтрамі рамёстваў, школамі народнай творчасці і інш.

Да найбольш удалых прыкладаў культурна-адукацыйнай дзейнасці, скіраванай на зберажэнне і папулярызацыю НКС, можна аднесці тэматычныя экскурсіі, распрацаваныя Мотальскім музеем народнай творчасці. Тэматыка экскурсіі «Жывы гук» залежыць ад каляндарнага цыклу і праходзіць з агучванне экспазіцыйных залаў музея палескай мелодыяй, песняй, музыкай у жывым выкананні народнага фальклорна-этнаграфічнага тэатра «Мотальскія суседзі». Некалькі тэматычных экскурсій знаёмяць наведвальнікам з цэлым комплексам абрадаў і звычаяў, звязаных з традыцыйным вяселлем. Падчас тэматычнай экскурсіі «Вясельны каравай» наведвальнікі музея назіраюць за працэсам стварэння вясельнага каравая, абрадавымі дзеяннямі, якія яго суправаджалі [5, л. 20]. Удзельнікі тэматычнай экскурсіі з’яўляюцца не толькі пасіўнымі слухачамі, але і прымаюць удзел у самім працэсе стварэння вясельнага каравая, які ў дадатак да ўсяго суправаджаецца адпаведнымі спевамі.

У Мотальскім музеі народнай творчасці распрацаваны музейна-педагагічныя заняткі, якія ў інтэрактыўнай форме знаёмяць з НКС. З 1997 г. праводзіцца занятак «У гасцях у бабулі Алены». Падчас занятку дзеці знаёмяцца з інтэр’ерам сялянскай хаты, традыцыйным адзеннем, народнай педагогікай, казкамі, калыханкамі, гульнямі. Занятак дапаўняе дэгустацыя. З 2005 г. праводзіцца музейна-педагагічны занятак «Вячорачкі», які знаёміць з інтэр’ерам сялянскай хаты і  рамёствамі, якімі займаліся ў зімовы перыяд. У 2015 г. з’явіўся музейна-педагагічны занятак пад назвай «Як кашуля ў полі вырасла». Ён знаёміць з ільноапрацоўкай і асаблівасцямі ткацтва [5, л. 21].

У музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» праходзяць вячоркі па-бездзежскі з удзелам фальклорных калектываў, сустрэчы з народнымі майстрамі падчас правядзння экскурсій, майстар-класы па ткацтве, прадзенню, вышыўцы, лозапляценню. У музеі праходзяць тэматычныя экскурсіі з дэгустацыяй традыцыйнай бездзежскай кухні. Праводзіцца экскурсія на мясцовым дыялекце, падчас якой адбываецца знаёмства з асаблівасцямі бездзежскай гаворкі. Мясцовая песенная традыцыя становіцца аб'ектам увагі на тэматычнай экскурсіі пад назвай «Галасы Палесся», што праходзіць з удзелам фальклорных калектываў. Элементы народных гульняў выкарыстоўваюцца ў экскурсіі «Бездзежскі кірмаш», а працэс апрацоўкі лёну з дэманстрацыяй тэхналагічных прыёмаў раскрываецца на тэматычнай экскурсіі «Лён любіць паклон» [5, л. 24].

Музейна-педагагічныя заняткі, распрацаваныя ў музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок», раскрываюць розныя аспекты традыцыйнай культуры і НКС. У 2000 г. распрацаваны занятак, прысвечаны апрацоўцы лёну, «Ад блакітных кветак да кашулі дзетак». З 2001 г. для вучняў старэйшых класаў праводзіцца занятак «Падарожжа ў вёску мінулага». Для навучэнцаў школы народнай творчасці праводзіцца занятак «Ад бабулі да матулі, ад матулі да мяне». Тэма веснавога абрадавага цыклу раскрываецца на занятку «Вясна-красна на ўвесь свет», які разлічаны на вучняў усіх узростаў [5, л. 24].

На базе музея штогод праходзяць музейныя святы. У 2012–2016 гг. падчас акцыі «Ноч музеяў» у Бездзежы праходзіла «Сустрэча са спадчынай», на якой адбываліся майстар-класы па ткацтве, прадзенню, народныя гульні, танцы, песні. Таксама ў музеі праводзяцца святы народнага календара «Масленіца» (з 2014 г.), «Купалле» (з 2014 г.), «Вадохрышча» (з 2014 г.), «Гуканне вясны» (з 2016 г.) [5, л. 25].

У культурна-адукацыйнай дзейнасці Столінскага раённага краязнаўчага музея для папулярызацыі НКС выкарыстоўваюцца такія формы працы, як віктарыны, квэсты, музейна-педагагічныя заняткі. Для наведвальнікаў 7–15 год распрацавана віктарына «Мазайка ручнікоў», падчас якой у інтэрактыўнай форме магчыма засвоіць значэнне ўзораў традыцыйнага арнаменту. Квэст пад назвай «Не шукаючы не знойдзеш» дазваляе пазнаёміцца з этнаграфічнай экспазіцыяй музея праз праходжанне нестандартных галаваломак, маршрутаў і пытанняў. Музейна-педагагічны занятак «Круціся, ганчарнае кола!» адбываецца з правядзеннем майстар-класу, які праводзіць ганчар з  в. Гарадная Столінскага раёна. [13].

У разглядаемы перыяд раённыя музеі Брэсцкай вобласці дасягнулі значных поспехаў у дакументаванні НКС, аб чым сведчыць назапашаны імі фота-, аўдыё-, відэаматэрыял. У той жа час пошукавую дзейнасць некаторых музеяў неабходна актывізаваць, спрыяць сістэматычнаму, а не эпізадычнаму вывучэнню рэгіёна.

У экспазіцыях большасці музеяўназіраецца перакос у бок прэзентацыі рамёстваў, а такія важныя тэмы, як вусныя традыцыі і формы выражэння, выканальніцкія мастацтвы, светапогляд людзей, міфалогія, традыцыйная

культура харчавання, застаюцца па-за ўвагай. Такое становішча абумоўлена складанасцямі, што ўзнікаюць пры спробах прэзентацыі элементаў НКС, якія наўпрост не звязаны з музейнымі калекцыямі. У той жа час прыклады Мотальскага музея народнай творчасці, Музея народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» і Столінскага раённага краязнаўчага музея сведчаць аб тым, што ў экспазіцыі магчыма і ажыццявіма на практыцы прэзентацыя розных абласцей НКС. У гэтых музеях былі створаны асобныя экспазіцыі: у будынку ветранога млына (2008 г., в. Моталь), сялянскі падворак «Каля плэса» (2012 г., в. Бездзеж), музей-сядзіба ганчара (2008 г., в. Гарадная). Яны дазваляюць прэзентаваць элементы НКС, выкарыстоўваючы інтэрактыўныя формы ўзаемадзення з наведвальнікамі. У дадзеным выпадку можа ісці гаворка аб стварэнні інтэрактыўных, «жывых» музейных экспазіцый.

У культурна-адукацыйная дзейнасці музеі выкарыстоўваюць разнастайныя формы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй: экскурсіі, лекцыі, музейна-педагагічныя заняткі, віктарыны, сустрэчы з носьбітамі традыцыі, майстар-класы, рэканструкцыі абрадаў або іх частак, музейныя святы, гульні (на падставе народных), квэсты. Часта музейныя святы і рэканструкцыі абрадаў суправаджаюцца выкананнем традыцыйных спеваў, дэгустацыямі ўласцівых рэгіёну страў. Усё гэта прыводзіць да павышэння эфектыўнасці музейнай камунікацыі, запатрабаванасці музеяў грамадствам. Камунікацыя музея з аўдыторыяй і мясцовай супольнасцю найбольш эфектыўна там, дзе ў галіне захавання НКС назіраецца ўзаемадзеянне музейнай установы і іншых устаноў культуры, прадстаўнікоў мясцовай супольнасці, недзяржаўных грамадскіх арганізацый.

У разглядаемы перыяд адбылася пэўная трансфармацыя раённых музеяў. Частка ператварылася выключна ў інструмент захавання артэфактаў і назапашвання ведаў аб НКС, а другая іх частка стала эфектыўным інструментам актывізацыі лакальнай супольнасці, месцам зберажэння, папулярызацыі і актуалізацыі нематэрыяльнай спадчыны. Найбольш удалы досвед інтэрпрэтацыі НКС музеямі Брэсцкай вобласці можа быць выкарыстаны для актывізацыі дзейнасці ў гэтым накірунку іншых музейных устаноў Рэспублікі Беларусь.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Text of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage // Official website of The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.unesco.org/culture/ich/index.php?lg=en&pg=00006. – Date of access: 10.10.2017.

2. Культура Республики Беларусь = Culture of the Republic of Belarus / Статистический сборник. – 2017. – С. 110.

3. Main obstacles for implementing the ICH-paradigm in museum practice and policy // Official website of Intangible Cultural Heritage & Museums Project [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.ichandmuseums.eu/en. – Date of access: 10.10.2017.

4. *Каулен, М. Е.* Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – Москва: Этерна, 2012. – 430 с.

5. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991 – 2016 гг.» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 6. – Воп. 14. – Спр. 234. – Л. 35.

6. Абрад «Намскі Вялікдзень» (в. Аброва, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл.) // Сайт «Жывая спадчына Беларусі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/nks/2089/. – Дата доступу: 14.10.2017.

7. Матэрыялы дасье на ўключэнне вясельнай каравайнай традыцыи вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей // Архіў бягучага справаводства Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – 31 л.

8. Аб музеі // Афіцыйны сайт музея народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.fartushok.by/index.php#top. – Дата доступу: 15.10.2017.

9. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси / [рэд. сав.: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін]. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2008. – 559 с.

10. О Столинском районном краеведческом музее // Афіцыйны сайт Столінскага раённага краязнаўчага музея [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://stolin.museum.by/node/41014. – Дата доступу: 20.10.2017.

11. Памяць. Лунінецкі раён: гіст.-дакум. хроніка / укл. Т. В. Канапацкая. – Мінск: Беларусь, 1995. – 716 с.

12. Дзяржаўная ўстанова культуры «Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей» // Афіцыйны сайт Івацэвіцкага раённага выканаўчага камітэту [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ivacevichi.brest-region.gov.by/index.php?option=comcontent&view=article&id=18882%3A2011-12-01-10-05-51&catid=524%3A2010-12-14-09-11-32&Itemid=1592&lang=ru. – Дата доступу: 12.10.2017.

13. Мультымедыйны інтэрактыўны занятак «Народныя касцюмы Століншчыны» // Афіцыйны сайт Столінскага раённага краязнаўчага музея [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://stolin.museum.by/node/41016. – Дата доступу: 20.10.2017.

**(Дата падачы: 21.02.2018 г.)**

*С. К. Хибиев*
Республиканский институт высшей школы, Минск
*S. Hibiev*
National Institute of Higher Education, Minsk

**УДК 94(4)«18»**

# ПОЯВЛЕНИЕ ПОНЯТИЯ «ГОСУДАРСТВЕННЫЙ НЕЙТРАЛИТЕТ» В ПОЛИТИЧЕСКОЙ ЖИЗНИ ЕВРОПЫ В XIX ВЕКЕ

# THE EMERGENCE OF THE CONCEPT OF «STATE NEUTRALITY» IN THE POLITICAL LIFE OF EUROPE IN THE XIX CENTURY

*В статье рассматривается вопрос появления термина «государственный нейтралитет» в политической жизни Европы, основные вехи истории государств, получивших статус нейтральных в XIX веке, а также политические условия, при которых эти страны получили свой статус.*